Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 23. Варыянт 3**

**Білет 23. Практычнае заданне. Гаспадарчае развіццё беларускіх зямель у XIV-XVIII стст.**

**Заданні стварыла:**Краўчанка Вольга Віктараўна, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА «Сярэдняя школа №2 г.Рагачова імя У.М.Калеснікава»

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Якія заняткі былі ў жыхароў Вялікага Княства Літоўскага ў сярэдзіне XVI ст.?
2. У сярэдзіне XVI ст. развіццё гарадоў і рост насельніцтва ў краінах Заходняй Еўропы выклікалі павелічэнне попыту на зерне. Продаж якіх сельскагаспадарчых культур у Вялікім Княстве Літоўскім даваў найбольшы даход?
3. Што ўплывала на цяжкае становішча сялян у сярэдзіне XVI ст.? Канкрэтызуйце свой адказ прыкладамі з крыніц.
4. Прывядзіце доказы таго, што ВКЛ выконвала ролю пасрэдніка ў гандлі паміж краінамі. Свой адказ растлумачце на падставе крыніц.

**Крыніца I**

**Дыяграма «Змяненні кошту на прадукцыю раслінаводства»(за 60 снапоў у грошах)**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца II**

**Схема "Катэгорыі і павіннасці сялян"**




**Крыніца III**

**Схема «Гандаль у ВКЛ»**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Адказы**

**1.**Развядзенне жывёл і птушкі (жывёлагадоўля, птушкагадоўля), раслінаводства (земляробства), гандаль.
**2.**Пацвярджэннем адказу з'яўляецца павелічэнне кошту на падставе дыяграмы за пшаніцу і жыта з 15 да 20 грошаў і лён з 12 да 24 грошаў.
**3.**Пацвярджэннем з'яўляецца тое, што на беларускай тэрыторыі павялічвалася колькасць прадукцыі, якая вырошчваецца для гандлю за мяжу.
Дзяленне сялян на катэгорыі і вялікая колькасць павіннасцей:
- паншчына (адпрацоўная павіннасць);
- аброк (натуральная падаць);
- чынш (грашовая падаць) і іншыя дадатковыя павіннасці рабілі жыццё сялян цяжкім.

**4.**Пацвярджэннем правільнасці адказу з'яўляецца сцвярджэнне аб тым, што на тэрыторыі ВКЛ адбываўся продаж тавараў, якія выраблялiся на беларускай тэрыторыі (унутраны гандаль), увозімых тавараў (знешні гандаль) і перапродаж увозімых тавараў (перапродаж солі, віна, каляровых металаў) на тэрыторыю іншых дзяржаў, напрыклад Расійская дзяржава (пасрэдніцкая роля).